# ПРАБЛЕМА РОДНАЙ МОВЫ Ў ПУБЛІЦЫСТЫЦЫ ПАЧ. XX – XXI СТ.: ПАРАЎНАЛЬНА-СУПАСТАЎЛЯЛЬНЫ АСПЕКТ

***Івашка І.А.,***
*студэнтка 4 курса БДУ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Лакцевіч К.В., ст. выкладчык*

Праблема ўжывання нацыянальнай мовы ў Беларусі ў пач. XX – XX ст. падымалася на розных узроўнях у мастацкай літаратуры, гістарычнай навуцы, мовазнаўстве, педагогіцы, публіцыстыцы [10]. Пытанне разглядалася шматаспектна: праз прызму развіцця культуры (Я. Лёсік, Я. Купала), нацыянальнага самавызначэння і фарміравання нацыянальнай годнасці (М. Гарэцкі, Я. Лёсік), з пункту правільнасці і чысціні мовы (В. Ластоўскі, Я. Скрыган), абнаўлення стылю (М. Воінаў), станаўлення правапісу (Б. Тарашкевіч, А. Луцкевіч, Я. Станкевіч), методыкі выкладання (Цётка, Я. Колас, С. Палуян). Даследчыкі вылучалі месца беларускага слова сярод іншых народаў, аналізавалі прычыны яго заняпаду, вызначалі ролю беларускай літаратуры ў фарміраванні патрыятызму, павагі да моўнай культуры беларуса, тлумачылі прычыны, паводле якіх беларуская мова з'яўляецца ключавым фактарам фарміравання светапогляду і асновай каштоўнасных арыентацый.

Гісторыя праблемы раскрываецца ў пач. XX ст.: ужыванне нацыянальнай мовы разглядалася гісторыкамі, пісьменнікамі, моваведамі, грамадскімі дзеячамі – В. Ластоўскім, Я. Лёсікам, Б. Тарашкевічам, Цёткай, Я. Купалам, Я. Коласам, С. Палуянам, З. Бядулем, А. Гаруном, М. Бабровічам, М. Лужаніным і інш. Доказ неабходнасці выкарыстання роднай мовы з'явіўся не толькі ў іх мастацкіх творах, але і ў публіцыстыцы. У к. XX – пач. XXI ст. праблема была актуалізавана ў публіцыстыцы Б. Сачанкі, А. Зэкава, Я. Скрыгана, А. Адамовіча, І. Шамякіна, К. Крапівы, навуковых артыкулах С. Станкевіча, Ф. Янкоўскага.

Актуальнасць даследавання вызначаецца адсунасцю прац па абагульненні вопыту прадстаўнікоў беларускай навуковай інтэлегенцыі к. XX – XXI ст. па тэме, недастатковай сістэматызацыяй прычын заняпаду беларускай мовы і асэнсавання публіцыстамі ролі роднай мовы як фактара фарміравання светапогляду чалавека, яго каштоўнасных арыентацый.

Мэта даследавання – прааналізаваць і сістэматызаваць навуковыя і творчыя абаснаванні і вывады пісьменнікаў, навукоўцаў і грамадскіх дзеячаў Беларусі ў пач. XX і XXI ст. па праблеме ўжывання беларускай мовы, акрэсліць асноўныя прычыны яе занядбання ў розныя перыяды беларускай дзяржаўнасці.

**Матэрыял і метады.** Падчас працы над работай былі разгледжаны і прааналізаваны публіцыстычныя артыкулы Я. Лёсіка, В. Ластоўскага, С. Палуяна, Я. Купалы, Б. Тарашкевіча, М. Гарэцкага, З. Бядулі, у якіх ў розныя часавыя адрэзкі (1909-1943 гг.) аўтары выказваліся пра беларускую мову, а таксама працы А. Адамовіча, Я. Скрыгана, Ф. Янкоўскага (1957 г.), Б. Сачанкі, А. Зэкава (пач. XXI ст.). У ходзе работы былі выкарыстаны эмпірычны, лагічны, тэарэтыка-пазнавальны, параўнальна-супастаўляльны, культурна-гістарычны, параўнальна-гістарычны, статыстычны метады даследавання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Паводле В. Ластоўскага беларуская мова – гэта «глаўны знак нашага брацтва», «апратка яго душы і яго думак» [4, с. 270], «найкрапчэйшы вузел, які звязвае бацькоў з дзяцьмі, людзей з людзьмі» [4, с. 252]. Гісторык прыводзіць прыклады неўжывання беларусамі нацыянальнай мовы, аднак робіць гэта на двух узроўнях: праз прызму маладых «адукаваных» дзяцей і іх сталых «забітых» бацькоў: «…сын, пабыўшы ў свеце, кідае мову бацькоў сваіх лёгка і скора, як дакураную папіросу, ані крыхуткі не падумаўшы аб тым, што, вярнуўшыся ў хату бацькоў, чужынцам будзе …» [4, с. 237]. «[Селянін] калі хоча паказацца разумнейшым або далікатнейшым, то панскай мовай загаворыць, а не сваёй, бо рабская ягоная душа і розум цёмны прымушаюць лічыць усё сваё … нечым горшым» [4, с. 237].

На глебе апошняга выказвання, як заўважае В. Ластоўскі, узнікае наступная праблема: «Дзяцей вашых у школе не вучаць шанаваць родную мову, а разам з тым і вас саміх. У школах дзіцё вучаць у чужой мове …» [4, с. 252]. Для яе вырашэння дзеяч прапануе: «А трэба, пакуль дзіцё малое, вучыць яго гаварыць роднай мовай, шанаваць гэту мову, каб не перакручвалі яе чужымі словамі; … тады … нічым з душы яго [сына] не выб'юць любві да свайго роднага … [4, с. 252]» З ім згодны і Б. Сачанка [8, с. 555]» .



Рэпазіторый БДУ

Пазней В. Ластоўскі адзначыць яшчэ некалькі прычын заняпаду роднага слова: «Тыя беларусы, што стараюцца гаварыць чужой мовай, унікаючы свае, бываюць або шэльмы-душапрадаўцы, ды перакіньчыкі, або проста людзі цёмныя, якіх апуталі ворагі нашага народу. Першыя не гавораць пабеларуску дзеля свае асабістае карысьці <…>. Другія не гавораць праз цемнату сваю, бо паверылі нашым ворагам, што мова наша «брыдкая», «простая» і за рознымі нашымі зладумцамі ідуць, як авечкі, на бойню» [5, с. 11].

Даследчык дае характарыстыку беларусу, які пазбягае сваёй мовы, з пункту гледжання маральных каштоўнасцей: «Хто не шануе родную мову, той не шануе сябе самога, ні свой род, ні сваіх дзядоў, – бацькоў, якія гэтай мовай гаварылі» [5, с. 12]. Яго думку падзяляе Я. Лёсік, які прыводзіць доказы, разглядаючы моўнае пытанне не толькі ў культурным і духоўным аспекце, але і ў палітычным: «<…> хто саромеецца сваёй мовы, хто не мае сваёй школы і не вучыцца на сваёй роднай мове, той заўсёды будзе цёмны і неразумны, як бязмоўнае стварэнне, і ім лягчэй камандаваць, лягчэй трымаць у прымусе ды ў пастаянным парабецтве» [6, с. 185].

Праблему ўжывання беларускай мовы на той час С. Палуян бачыць у адсутнасці ў Беларусі нацыянальнай школы: «Як навука ў чужой мове да беларуса дрэнна прыстае, то і не можа ён быць асвечаным <…>. Вялікая навука <…> панавала калісь на беларускай зямлі, а цяперашняя неахвота да кніжкі ідзе ў нас дзеля таго, што кніжка чужая». Гэту думку падтрымлівае Я. Лёсік [6, с. 185]. Дзеяч, як і многія яго аднадумцы (М. Гарэцкі [2, с. 604]), часта адсылае чытача да часоў русіфікацыі і паланізацыі Беларусі: «Іншыя народы ішлі ўперад, развівалі і мову сваю <…> а ў нас, беларусаў, нічога гэтага не было, бо ў нас адабралі нашую мову … » [6, с. 278]. Б. Сачанка бачыць гістарычную праблему ў тым, што «у Беларусі «сходзіліся народы спрэчкі зброяю канчаць»[8, с. 540]. «Самабытнасць народа – у яго мове, гісторыі, культуры… Гэта добра ведалі ўсе заваёўнікі і заняволенне іншых народаў … пачыналі з разбурэння і знішчэння чужой ім духоўнай спадчыны» [8, с. 542].

Пытанні навучання на беларускай мове разглядае ў сваіх артыкулах Б. Сачанка і звяртае ўвагу на заняпад мовы: «Куды-б ты не паступаў – у тэхнікум або інстытут беларускай мовы й літаратуры здаваць ня трэба… Родная мова амаль ня ўжываецца ні на шыльдах, ні на этыкетах». У двух выпадках заняпад беларускай мовы звязаны з палітыкай русіфікацыі.

Над змяненнем у нацыянальнай свядомасці ў п.п. XX ст. разважае Я. Купала: «Беларус … выракаючыся мовы сваёй, ён бы мусіў вырачыся самога сябе … выракаючыся, мусіў бы ісці проці ўсяго святога, непадменнага на свеце» [3, с. 538]; «<…> асталіся і мы самі як народ, як нацыя, і асталася пры нас наша простая родная мова» [3, с. 539]. Тэндэнцыю да змянення паводзін людзей на карысць беларускай мовы заўважаем і ў артыкулах З. Бядулі. Я. Скрыгана прыводзіць дзве прычыны захавання беларускай мовы: шчыльную сувязь пісьменнікаў з народам, вывучэнне фальклору [9, с. 430].

**Заключэнне.** Такім чынам, праблема выкарыстання беларускай мовы з'яўляецца адной з ключавых ў публіцыстыцы ахопленага перыяду, а пераасэнсаванне звязаных з ёй пытанняў працягваецца і ў наш час. Акрэсленыя праблемы закранаюць усе бакі сучаснага адукацыйнага працэсу. Даследаванне адлюстравала абагульненую пазіцыю беларускай інтэлігенцыі к. XX – XXI стст. па пытаннях актуалізацыі беларускай мовы сярод беларусаў. Запатрабаваным, на наш погляд, можа стаць даследаванне і сістэматызацыя поглядаў прадстаўнікоў розных часавых перыядаў беларускай літаратуры па акрэсленай праблеме.


1. Бядуля, З. Збор твораў. Т.5 : Язэп Крушынскі : раман : Кн.2; Сярэбраная табакерка : казка; Публіцыстычныя артыкулы / З. Бядуля . – Мінск : Маст. літ., 1989 . – 519 с.
2. Гарэцкі М. Выбраныя творы / М. Гарэцкі; уклад. Р. Гарэцкага і Т. Голуб, прадм. і камент. Т. Голуб. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 640 с.
3. Купала, Я. Выбраныя творы / Янка Купала; уклад. У. Гніламёдава, А. Шамякінай; Камент. А. Шамякінай; Прадм. Н. Гілевіча. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2002. – 640 с.
4. Ластоўскі, В. Выбраныя творы: / В. Ластоўскі; уклад., прадмова і камент. Я. Янушкевіча – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 512 с.
5. Ластоўскі, В. Што трэба ведаць кожнаму беларусу / В. Ластоўскі. – 2-е выд. пашырыў Я. Найдзюк. – Мінск : Выдавецтва ва падруч. і літ. для моладзі, 1943. – 30 с.
6. Лёсік, Я. Творы: Апавяданні. Казкі. Артыкулы / Уклад., прадм. І камент. А. Жынкіна. – Мінск: Маст. літ., 1994. – 335 с.
7. Палуян, С. Лісты ў будучыню: Проза. Публіцыстыка. Крытыка / Уступ слова І. Шамякіна; уклад., падрыхт. тэксту, прадм. і камент. Т. Кабржыцкай і В. Рагойшы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. – 216 с.
8. Сачанка, Б.І. Выбраныя творы / Барыс Сачанка ; уклад. Галіны Багданавай ; прадм. Уладзіміра Гніламёдава. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 636 с.
9. Скрыган Я. Выбраныя творы / Ян Скрыган / Кулад., камент. Г. Скрыган і К. Цвіркі: Прадм. В. Кавалеўскага. – Мінск.: Бел. Кнігазбор, 2005. – 544 с.
10. Тарашкевіч, Б. Выбранае: Крытыка. Публіцыстыка. Пераклады / Браніслаў Тарашкевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1991. – 318 с.


Репозиторий ВГУ